

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 2 (219) 31 студзеня 1995 года, аўторак


ЭКСПРЭС-ІНФАРМАЦЫЯ

## СОРАСАЎСКІЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

Як стала вядома, падведзены вынікі падпраграмы «Студэнты - Сорасаўскія стыпендыяты», якая праводзілася ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце пры садзейнічанні Міжнароднай сорасаўскай праграмы адукацыі ў галіне дакладных навук.

Некалькі дзён таму на імя рэктара Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы Півача Л.М. паступіў ліст ад выканаўчага дырэктара праграмы спадара А.Шубы.

У ім паведамляецца, што студэнты нашага універсітэта «увайшлі ў лік пераможцаў».

Хто ж гэтыя шчаслiўчыкі?

Гэта студэнты матэматычнага факультэта *Аляксандр Лялікаў* (1 курс), *Станіслаў Сабалеўскі* (1 курс), *Андрэй Бакурэвіч* (4 курс), *Аляксандр Кобрын* (4 курс), *Раман Сінкевіч* (4 курс) і *Аляксандр Грынь* (5 курс).

Былі таксама адзначаны і студэнты яшчэ двух факультэтаў. Сярод біёлагаў Сорасаўскімі стыпендыятамі сталі *Алена Зайцава* (4 курс), *Дзмітры Прэабражэнскі* (4 курс), *Наталля Кучынская* (4 курс), *Дзмітры Вінчэўскі* (5 курс).

На фізіка-тэхнічным факультэце вызначаны толькі адзін пераможца - *Павел Дораш* (4 курс).

## ПОМНЯЦЬ АБ ВЕТЭРАНАХ

У канцы снежня мінулага года ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце адбыўся пераднавагодні сход ветэранаў нашага універсітэта.

У цёплай, амаль хатняй атмасферы прайшла гэтая сустрэча. Першым на вечарыне выступіў рэктар універсітэта Леанід Мікалаевіч Півач. Ён павіншаваў ветэранаў з наступаючым Новым годам, пажадаў ім добрага здароўя, доўгіх гадоў жыцця.

А потым быў канцэрт. Яго падрыхтавалі выкладчыкі аддзялення мастацтваў. Гучалі песні, музыка. Дэканы факультэтаў таксама выказалі свае віншаванні і пажаданні ўсім прысутным.

Кожнаму ветэрану былі ўручаны грошы - па 160 тысяч рублёў (а ўсяго для аказання матэрыяльнай дапамогі ветэранам рэктаратам было выдзелена 9,5 мільёна рублёў).

Ветэраны пагутарылі за кубачкам чаю, падзяліліся сваім багатым жыццёвым вопытам.

Застаецца падзякаваць за гэтую святочную вечарыну рэктарату і прафкаму, усім тым, хто не пашкадаваў сілаў для яе арганізацыі. Вялікі дзякуй ад усіх ветэранаў!

*П.В.ВАСІЛЬЕЎ,*
*член гарадскога савета ветэранаў, старшыня савета ветэранаў універсітэта.*



**Пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб прысуджэнні Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 1994 года ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры» ад 29 снежня 1994 года зацверджана рашэнне Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры і прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь 1994 года ў галіне тэатра і кіно БАНДАРЭНКУ АНДРЭЮ ВАСІЛЬЕВІЧУ, кампазітару, - за оперу «Князь Наваградскі», пастаўленую ў Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета.**

**Калектыў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы шчыра віншуе Андрэя Бандарэнку і жадае яму далейшых творчых поспехаў, плённай працы ў развіцці музычнай культуры на Гродзеншчыне!**

*(Аб творчасці Андрэя Бандарэнкі - 6-я стар.)*

# КАРСКІЯ

14-15 снежня 1994 года ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы адбыліся V навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці таленавітага беларускага мовазнаўцы і гісторыка Я.Ф.Карскага.

У канферэнцыі, якая стала ўжо традыцыйнай, удзельнічалі прадстаўнікі розных навуковых цэнтраў нашай рэспублікі, а таксама госці з Літвы і Расіі. Асноўная праблематыка канферэнцыі была сфакусавана на двух кірунках: навуковая спадчына Я.Карскага і сучаснае мовазнаўства; супастаўляльныя даследаванні роднасных і няроднасных моўных сістэм (функцыянальна-семантычны і функцыянальна-камунікатыўны аспекты). Тым не менш значная колькасць дакладаў не была абмежавана рамкамі дадзенай праблематыкі і адлюстроўвала разнастайнасць навуковых інтарэсаў удзельнікаў канферэнцыі. Гэта стала відавочна ўжо на пленарным пасяджэнні.

Пасля прывітальнага слова, з якім звярнуўся да прысутных першы прарэктар ГрДУ А.К.Краўцэвіч, выступіла Н.Ю.Паўлоўская (Мінск) з дакладам «Пытанні мадальнасці ў лінгвістычнай канцэпцыі Я.Ф. Карскага». Дацэнт глыбока і рознабакова адлюстравала погляды акадэміка на такую значную граматычную катэгорыю, як мадальнасць. Асаблівая ўвага была звернута на тое, што ўжо ў пачатку XX стагоддзя ў працах нашага земляка з'явіўся функцыянальна-семантычны падыход да аналізу розных аспектаў мадальнасці.

З цікавасцю заслухалі В.К.Шчэрбіна.



Галоўны спецыяліст Прэзідыума АН Беларусі ўказаў на неабходнасць больш актыўнага выкарыстання лексікаграфічнай тэхнікі пры паэтапным апісанні граматычнай семантыкі.

Прафесар А.І.Яновіч (Мінск) падрабязна спынілася на адной з характэрных рыс стылістыкі беларускіх загадак- метафарызацыі сэнсу выказвання, што істотна для разумення характару суадносінаў паміж тэкстам загадкі і метафарай.

Жывы водгук у слухачоў выклікала



выступленне прафесара Л.В. Судавічэне. Госця з Вільні пазнаёміла ўдзельнікаў пасяджэння са структурай і зместам новай кнігі «Русский язык для деловых людей», над якой працуе аўтар у апошні час.

З нечаканым па тэме дакладам выступіла Г.Мішкінене (Вільня) -«Адаптация арабско-турецких заимствований в китабе КУ - 1446», дзе на прыкладзе перакладу аднаго са старажытных рукапісаў з арабскай ці турэцкай моваў была прадэманстравана гібкасць сістэмы старабеларускай мовы.

Дацэнт В.С.Сідарэц (Мазыр) с выкарыстаннем аб'ёмнага фактычнага матэрыялу і ўлікам мноства аспектаў прааналізаваў спецыфіку суіснавання пары «вербоід-дзеяслоў» як параўнальных сродкаў дзеяслоўнай намінацыі.

У дакладзе прафесара М.І.Канюшкевіч (Гродна) быў разгледжаны адзін з магчымых варыянтаў пабудовы такой мадэлі апісання ў полі параўнання, якая дазволіла б вызначыць межы дадзенай катэгорыі і паказаць яе эксплікатары ў выглядзе арганізаванай і дасканалай сістэмы, даступнай супастаўляльнаму апісанню.

Дацэнт Л.В.Рычкова (Гродна) ў сваім выступленні закранула досыць актуальную ў наш час праблему - неабходнасць рэгламентацыі перадачы запазычанняў сродкамі беларускай мовы.

Зацікавілі прысутных і даклады дацэнта Л.М.Серады (Гродна) «Актыўныя працэсы словаўтварэння ў англійскай мове», намесніка дырэктара Інстытута мовазнаўства АН Беларусі А.А.Лукашанца «Спецыфіка сінаніміі словаўтваральных сродкаў», дацэнта В.Л.Малышавай (Гродна) «Обучение деловому общению на занятиях по английскому языку».

Пасля перапынку, за які госці паспелі пазнаёміцца з нашым старажытным горадам і сфатаграфавацца на памяць на ганку універсітэта, работа працягвалася па секцыях.

На секцыі «Функцыянальна-сістэмныя даследаванні моўных сістэм» быў заслуханы шэраг паведамленняў нетрадыцыйнай тэматыкі. Так, у дакладзе Т.Л.Ляхновіч (Горкі Магілёўскай вобласці) былі падрабязна прааналізаваны факты, што адносяцца да катэгорыі ступені дзеяслоўнага дзеяння, якая даўно была ў полі зроку граматыстаў, але асобна не вылучала-



# ЧЫТАННІ

ся. Увядзенне ў навуковы ўжытак яе тэрміналагічнага абазначэння дазволіла б, на думку выступоўцы, аб'яднаць і аднатыпна апісаць усе суадносныя суфіксальныя формы дзеяслова, параскіданыя зараз па розных граматычных рубрыках.



Зацікавіла слухачоў і выступленне Н.П.Маславай (Горкі Магілёўскай вобласці) «Индентификация объекта оценки в условиях косвенной референции», прысвечанае адной з актуальных праблем рэферэнцыйнай семантыкі. На думку аўтара, адным з канкрэтных дадаткаў прагматычнага аналізу моўных структур павінна быць тэорыя інтэрпрэтацыі мастацкіх твораў.

Шэраг дакладаў, прапанаваных на гэтай секцыі, адлюстроўвалі навуковыя пошукі выкладчыкаў кафедры рускай мовы і былі звязаны з праблемай стварэння супастаўляльнай функцыянальнай граматыкі рускай і беларускай моваў (дацэнты Л.І.Смольская, С.Я.Кострыца, В.Л. Лешчанка).

У цэнтры ўвагі другой секцыі былі самыя разнастайныя праблемы сучаснай лінгвістыкі: ад моднага ў наш час маўленчага этыкету да метадыкі выкладання моваў.

Шмат пытанняў выклікаў даклад С.Вікулавай «Ситуативная вариативность вопросительных высказываний», пабудаваны на матэрыяле англійскай мовы. Ён з'явіўся вынікам апрацоўкі пратаколаў дыскусій 10 міжнародных канферэнцый і сімпозіумаў па прыродазнаўчых навуках.

Найлепшымі аднадушна прызнаныя даклады дацэнта Н.С.Грабенічыковай (Гродна) «История и функционирование в русском языке этикетных слов с основой господ-», з якога стала відавочна, колькі гадзін нястомнай працы і самаадданасці патрабуецца ад даследчыка гісторыі мовы, і прафесара Г.У.Ярмоленкі «Особенности синтаксической организации глав «Тихого Дона», посвященных Илье Бунчуку».

Абгрунтавана і на высокім узроўні прагучалі выступленні аспірантак Т.М.Саўчук (Мінск) і Т.А.Піваварчык.

Пасяджэнне секцыі N 3 было прысвечана шматлікім праблемам, якія паўстаюць сёння перад беларусазнаўцамі.

Т.І.Тамашэвіч і З.М.Тамашэвіч у сваім дакладзе «Талент, прадказаны Карскім» звярнуліся да лексікаграфічнай спадчыны М. Гарэцкага, больш вядомага нам у якасці пісьменніка. М.Гарэцкі не меў адпаведнай адукацыі, але яго слоўнікі атрымалі высокую адзнаку спецыялістаў-філолагаў.

М.А.Якалцэвіч (Гродна) напомніла слухачам аб той неаслабнай зацікаўленасці, з якой Я.Ф.Карскі звяртаўся да такіх спецыфічных формаў народнай творчасці, як прыказкі і прымаўкі. Дацэнт падрабязна спынілася на сродках іх размежавання ў сучаснай лінгвістыцы.

Цікавым па зместу быў даклад старшага выкладчыка П.Л.Навіцкага.

І нават пасля таго, як канферэнцыя фактычна спыніла сваю работу, разгарэлася дыскусія па праблемах супастаўляльнай функцыянальнай граматыкі рускай і беларускай моваў, якая працягвалася больш як дзве гадзіны.

Глыбокая зацікаўленасць навукоўцаў у сваёй справе, імкненне пераадолець ўсе цяжкасці, якія паўсталі на іх шляху ў наш час, сведчаць аб тым, што V Карскія чытанні не былі апошнімі. Яны ўжо даўно перараслі тыя рамкі, якія некалі акрэслілі заснавальнікі канферэнцыі. Па словах прафесара з Вільні Судавічэне, у якіх не гучала ніякай іроніі, ва ўмовах ізаляванасці ад буйных навуковых цэнтраў былога СССР Гродна паступова ператвараецца ў лінгвістычную сталіцу заходніх зямель. І, як дадала А.І.Яновіч, сталым навукоўцам можна не баяцца, што іх справа знікне: маладое пакаленне не ўступае сваім старэйшым калегам ні па шырыні навуковых інтарэсаў, ні па глыбіні асэнсавання звязаных з імі праблемаў.

***А.НІКІЦЕВІЧ,***
***дацэнт кафедры рускай мовы.***
***Фота У. САРОКІНА.***

## СКЛАД ПРАФКАМА

***Старшыня прафкама:***

ХІЛЮТА УЛАДЗІМІР АНДРЭЕВІЧ - дацэнт кафедры агульнай гісторыі.

***Намеснік старшыні прафкама:***

РОЎБА ЯЎГЕН АЛЯКСЕЕВІЧ - загадчык кафедры тэорыі функцый, дацэнт.

***Члены прафкама:***

БЕРАЗОЎСКАЯ ЛЮДЗМІЛА РЫГОРАЎНА - ст. выкладчык кафедры дзяржаўнага і працоўнага права.

БАБРОЎНІК ЛІЛІЯ ІВАНАЎНА - інжынер І катэгорыі.

ІВАНОЎ АЛЯКСЕЙ ЮР'ЕВІЧ - загадчык кафедры дастасоўнай оптыкі, дацэнт.

ЛЯСКОВА ГАЛІНА ФЁДАРАЎНА - бібліятэкар II катэгорыі.

МАНДРЫК КАНСТАНЦІН АЛЯКСАНДРАВІЧ - загадчык кафедры анатоміі і фізіялогіі, дацэнт.

МАРЦЕН МАЙЯ УЛАДЗІМІРАЎНА - дацэнт кафедры агульнай гісторыі.

МІНЮК СЦЯПАН АНДРЭЕВІЧ - загадчык кафедры дыферэнцыяльных ураўнаванняў, прафесар.

МУРЗІЧ ЛЮДЗМІЛА ІВАНАЎНА - ст. выкладчык кафедры рускай і замежнай літаратуры.

НАВІЦКІ ПЁТР ЛЯВОНАВІЧ - ст. выкладчык кафедры мовазнаўства.

АЖОГІН МІКАЛАЙ ІОСІФАВІЧ - ст. выкладчык кафедры фізвыхавання.

СТАШКЕВІЧ ЛІЛІЯ ІОСІФАЎНА - камендант інтэрната N 3.

ЧАРНІЛОЎСКАЯ ЛЮДЗМІЛА ІВАНАЎНА - ст. выкладчык кафедры музыкі.

ШУШКЕВІЧ СВЯТЛАНА УЛАДЗІМІРАЎНА - ст. выкладчык кафедры матэматыкі і методыкі выкладання матэматыкі.

# ФАКУЛЬТЭТ ЗАМЕЖНЫХ МОВАЎ

## Распавядае Л.Рычкова, дэкан факультэта замежных моваў

Рашэннем Вучонай Рады універсітэта на базе філалагічнага факультэта з 1 ліпеня 1994 года створаны факультэт замежных моваў.

Класічныя мовы і літаратуры, руская мова і літаратура (са спецыялізацыямі «Рыторыка» і «Руская мова як замежная»), англійская, нямецкая, французская мовы, - вось пералік спецыяльнасцяў, па якіх на новым факультэце вядзецца падрыхтоўка, пачынаючы з 1994/95 навучальнага года.

Спецыялісты па класічных мовах і літаратуры, атрымаўшы кваліфікацыю «Філолаг. Выкладчык класічных моваў і антычнай літаратуры», змогуць працаваць выкладчыкамі лацінскай і старажытнагрэцкай моваў, выкладаць антычную літаратуру у вышэйшых навучальных установах, гуманітарных ліцэях, гімназіях. Вялікі запас ведаў па іншых старажытных мовах: стараславянскай, старажытнарускай, старарускай і старабеларускай, - дазволіць ім займацца плённай навуковай працай у музеях і архівах, дзе чакаюць апрацоўкі спецыялістаў старажытныя рукапісы, сярэднявечныя кнігі. Добра авалодаўшы сучаснай беларускай мовай (а гэта таксама



прадугледжана навучальным планам), яны змогуць рабіць мастацкія пераклады старажытнагрэцкіх і рымскіх літаратурных твораў. Дарэчы, спецыялістаў такога профілю ніколі не рыхтавалі нідзе на Беларусі.

Дзве замежныя мовы ( англійскую і нямецкую; нямецкую і англійскую; французскую і англійскую) будуць ведаць і змогуць выкладаць у школе тыя, хто пройдзе курс падрыхтоўкі на факультэце па адпаведнай спецыяльнасці. Яны будуць добра валодаць і дзяржаўнай мовай. Пры жаданні можна будзе вывучыць яшчэ адну-дзве мовы на ўзроўні карыстання.

Не пашкадуюць тыя, хто ў гэтым годзе абраў спецыяльнасць «Руская мова і літаратура», бо праз 5 гадоў яны атрымаюць кваліфікацыю «Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры і рыторыкі», або «Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры з веданнем англійскай мовы, выкладчык рускай мовы як замежнай». Першую з пералічаных кваліфікацый можна атрымаць і ў Белдзяржуніверсітэце, з другой на Беларусі спецыялістаў не рыхтавалі.

Рыторыка - навука, якая вучыць правільна і прыгожа выказваць думкі. Таму у вну, каледжах, ліцэях і гімназіях рыторыка выкладаецца як вучэбны прадмет. Авалодаць майстэрствам красамоўства, звяртаючыся да класікаў-рытараў і абапіраючыся на навуковыя дасягненні сучаснай рыторыкі, змогуць студэнты, якія абралі гэтую спецыялізацыю. Тыя, каго зацікавіла спецыялізацыя «Руская мова як замежная», побач з рускай на працягу чатырох з паловай гадоў будуць вывучаць англійскую мову і здаваць па ёй дзяржаўны экзамен. Веды, якія атрымаюць студэнты, дазволяць ім авалодаць англійскай мовай на ўзроўні карыстання і, пры неабходнасці, выкладаць яе ў школе. Дапамогуць гэтыя веды і пры выкладанні рускай мовы за мяжой, або замежным вучням ў Беларусі. Студэнты змогуць авалодаць усімі сучаснымі методыкамі выкладання рускай мовы як у тэарэтычным, так і ў практычным аспектах, што дазволіць ім на высокім узроўні выкладаць рускую мову і літаратуру самым розным катэгорыям навучэнцаў.

# БРАНІСЛАВА БАРЫСАЎНА ВІЦ-МАРГУЛЕС

Споўнілася 50 гадоў навуковай дзейнасці вядомага беларускага антыкаведа Браніславы Барысаўны Віц-Маргулес.

Нарадзілася Браніслава Барысаўна 21 верасня 1918 года ў г.Драгобыч Львоўскай вобласці, але ў сваёй аўтабіяграфіі яна сціпла напісала: «Сваёй Радзімай ужо даўно лічу Беларусь і родным горадам - Гродна».

У г.Львове Б.Б.Віц-Маргулес скончыла польскую гімназію гуманітарнага тыпу імя Ю.Славацкага і паступіла на гуманітарны факультэт Львоўскага універсітэта адразу на два аддзяленні: класічнай філалогіі, а таксама філасофіі. З усталяваннем у 1939 годзе савецкай улады ў Заходняй Украіне працягвала вучобу на гістарычным факультэце універсітэта. У 1944 годзе была залічана ў аспірантуру Сярэднеазіяцкага універсітэта па спецыяльнасці «Гісторыя старажытнага свету». Навуковай спецыялізацыяй была гісторыя антычнай філасофіі, а тэмай кандыдацкай дысертацыі - вучэнне Пратагора.

Пасля заканчэння вайны Б.Б.Віц-Маргулес пераехала ў Ленінград, дзе працягвала вучобу ў аспірантуры Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. У пачатку 50-х гадоў яна паехала ў Карэлію і там працавала ў сярэдняй школе настаўнікам гісторыі, тут жа рыхтавалася да абароны дысертацыі. У 1953 годзе дысертацыя была абаронена. У пратаколе было запісана, што дысертанту можна прысвоіць не толькі званне кандыдата гістарычных, але і філасофскіх навук.

У 1954 годзе Б.Б.Віц-Маргулес пераехала ў Вільню. Тут яна працавала ў настаўніцкім інстытуце з польскай мовай выкладання. У 1965 годзе Б.Б.Віц-Маргулес пераехала ў Гродна, дзе 20 гадоў працавала выкладчыкам філасофіі, этыкі, эстэтыкі ў сельскагаспадарчым інстытуце, а пасля арганізацыі Гродзенскага універсітэта - ужо на кафедры ўсеагульнай гісторыі гістарычнага факультэта. Зараз Браніслава Барысаўна працуе на кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства, садзейнічае станаўленню новай спецыяльнасці "Класічныя мовы і літаратуры". У навуковай працы засталася вернай антычнай гісторыі і антычнай філасофіі. Манаграфія (Демокрит.М., 1979), перакладзеная на літоўскую і эстонскую мовы, шэраг артыкулаў, шматлікія даклады і тэзісы на навуковых канферэнцыях - сведчанне грунтоўных даследаванняў антычных крыніц. Асноўныя тэмы яе даследаванняў: 1) антычныя тэорыі грамадскага працэсу, 2) пытанні вывучэння антычнай культуры, 3) ранняе хрысціянства і антычнае вольнадумства, 4) біяграфіі антычных філасафаў. Працы вучонай аб творчасці вальнадумца Лукіяна былі высока ацэнены замежнымі вучонымі.

«Калі гаварыць аб сваіх поглядах, - піша вучоная, - то думаю аб тым, ці многа я «застойвалася» у «застойлівыя» гады.Мне здавалася, што я іду ў нагу з часам, дзе адстаючы, а дзе, мабыць, крышачку апярэджваючы... Тэорыя марксізму не была для мяне адзінай; самі класікі вучылі, што трэба карыстацца ўсім духоўным здабыткам чалавецтва... У мяне склаўся вызначаны светапогляд дзякуючы чытанню гуманістычнай еўрапейскай мастацкай і гістарычнай літаратуры... Мабыць, таму я і марксісцкую тэорыю разумела выключна з духу гуманізму і дэмакратыі, спачуваючы прыгнечаным. Усё ж такі, як бы там ні было, а антыказнаўства трэба зрабіць больш вядомым і папулярным.Тым болей што незалежна ад практычнай карысці ўсякае веданне, і асабліва аб'ектыўнае веданне гісторыі чалавецтва, вельмі добра».

Жадаем паважанай Браніславе Барысаўне здароўя і жыццёвага аптымізму!

***Калегі па кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства.***



## МУЗЫЧНЫ САЛОН

# СУЧАСНАЕ І МІНУЛАЕ

Андрэй Бандарэнка скончыў Гродзенскае музычнае вучылішча па класу фартэпіяна, затым у 1981 годзе Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па класу кампазіцыі Д.Смольскага, а ў 1985 годзе - асістэнтуру-стажыроўку пад яго ж кіраўніцтвам.

Удумлівы, сур'ёзны музыкант, які выпрабоўвае глыбокі інтарэс да гістарычнай тэматыкі.

Яшчэ ў студэнцкія гады піша кантату «Радзіма» на вершы беларускага паэта Пімена Панчанкі (1981), «Аповесць аб разбурэнні Разані Батыям» на старажытнарускія тэксты з «Слова о погибели земли русской» і «Повести о разорении Рязани Батыем» (1981).У гэтых творах развіваецца тэма Радзімы, з вобразам якой звязаны лёс славянскага народа, яго мінулае і сучаснае.У іх відаць цесную сувязь фальклорных вытокаў, старажытнаславянскага меласа і сучасных сродкаў музычнай выразнасці. Гэтыя творы з'явіліся пачаткам славянскай лініі ў творчасці кампазітара.Ад яе цягнуцца ніці да харавых твораў канца 80-х гадоў, віяланчэльнай фантазіі «Славянская старажытнасць» (1986).



У 1985 годзе ён піша новы твор, які працягвае гістарычную тэму - араторыя «Думы рускія» на словы А.Талстога.Яна напісана ў эпічнай манеры, карані якой у старажытнаславянскай і рускай класічнай музыцы. Узнаўляецца асобы славянскі каларыт.

Харавы канцэрт «Пахвала вялікаму князю Уладзіміру Святаслававічу» на старажытнарускі тэкст з «Слова о законе и благодати» мітрапаліта Кіеўскага Іларыёна (XI ст.) (1987) - адзін са значных твораў старажытнаславянскай лініі ў творчасці А.Бандарэнкі.Ідэя народжана вобразамі старажытнай Русі і рускай праваслаўнай царквы. Глыбока раскрываючы ідэйна-філасофскі сэнс першакрыніцы, дзе апяваюцца вечныя ісціны дабрыні і красаты, кампазітар імкнецца да стварэння сучаснай канцэпцыі духоўнай музыкі.Ён выкарыстоўвае дасягненні кампазітарскай тэхнікі XX стагоддзя, новыя музычна-выразныя і драматургічныя сродкі, звяртаючыся да санорных гучанняў, якія ствараюць эпізоды, кантрастныя распеўнай мове, што ўслаўляе дзеянні вялікага князя. Ідэя з'яднання людзей і ўслаўлення чалавека вызначае ўзнёслы строй музыкі і характар яе нетаропкага развіцця, якое вядзе свой пачатак з пеўчых традыцый старажытных славян. Харавы канцэрт гучаў на юбілейным пленуме Саюза кампазітараў Беларусі, прысвечаным 1000-годдзю хрышчэння Русі.Сёння канцэрт - у рэпертуары вядучых харавых калектываў рэспублікі.

У рэчышчы прыхільнасцяў кампазітара - творы пачатку 90-х гадоў: канцэрт для хора і салісткі-сапрана «Вячэрняя малітва» на словы С.Грахоўскага, выкананы на фестывалі «Мінская вясна - 94» з вялікім поспехам; літургія Іаана Златавуста, атрымаўшая высокія адзнакі пасля выканання на З'ездзе кампазітараў Беларусі.

Іншым напрамкам творчых інтарэсаў Андрэя Бандарэнкі, які таксама сфармаваўся ў гады вучобы, стала найноўшая музыка, з якой звязаны пошукі кампазітара ў галіне музычнай мовы, інструментальных саставаў, формаў.Сімфанічная паэма «Антыфон» (1980), «Музыка для габоя, аргана, струнных і ўдарных» (1984), струнны квартэт (1984).Яны ўражваюць маляўнічасцю аркестра, арыгінальным саставам, што часткова звязана з пошукамі ў галіне тэмбру.Калі ў сімфанічнай паэме пераважвае ўнутраная сканцэнтраванасць і напружаная экспрэсія, то квартэт афарбаваны ў лірыка-эпічныя таны.

Сур'ёзнае захапленне вялікай формай прыводзіць кампазітара да засваення новых для сябе жанраў.У гэтым рэчышчы - сімфонія для камернага аркестра (1986), канцэрт-паэма для скрыпкі, віяланчэлі, фартэпіяна і камернага аркестра (1988). Яны пашыраюць дыяпазон яго творчасці, яшчэ раз сведчаць аб багатай фантазіі і вынаходлівасці кампазітара.

Творам, які сінтэзуе абодва напрамка творчасці Андрэя Бандарэнкі, з'явілася опера «Князь Наваградскі» на лібрэта В.Іпатавай па п'есе Л.Пракопчыка (1992).Гэта опера на сюжэт з глыбінных пластоў гісторыі, звязанай з каранямі дзяржаўнасці Беларусі, сапраўднымі гістарычнымі падзеямі, легендарнымі вобразамі першых князёў Вялікага Княства Літоўскага - Міндоўга і Войшалка.«Князь Наваградскі» пачынаецца аркестровым уступам, у аснове якога ляжыць лейтматыў дзяржаўнасці, урачысты, як гімн, і заканчваецца ім.

Яскрава выяўленая сацыяльна-гістарычная накіраванасць оперы прадвызначыла высокі ўзровень інтанацыйнага абагульнення.У музыцы Андрэя Бандарэнкі арганічна спалучаюцца старажытнаславянскі стыль харавых эпізодаў, напісаных у традыцыях праваслаўнага спявання на кананічны тэкст хрысціянскіх малітваў, і сучасная музыка з характэрнымі для яе складанымі гарманічнымі спалучэннямі, своеасаблівым рытмам, тэмбравым каларытам.Абодва тэматычныя пласты - архаічны і сучасны - цесна ўзаемадзейнічаюць на працягу ўсяго музычна-драматычнага развіцця оперы. «Князь Наваградскі» - значная мастацкая з'ява, якая стала адной з прыкметных падзей музычна-грамадскага жыцця Беларусі.

Па матэрыялах оперы створана «Прытча аб Душы чалавечай» для саліста, хора і аркестра. Гэта асобая лірыка-эпічная форма роздуму, малітвы.Яна няспешная, нясуетная, філасафічная і ўзнёслая.Мера ў ёй - красата, як у прытчы, у надчасовым. Для А.Бандарэнкі гэтае паняцце - красата ў музыцы- вельмі значнае.Яго светапогляд, эстэтычны прынцып: музыка павінна быць прыгожай, несці красату перш за ўсё духоўнага свету.І ў гэтым адна з прычын таго, што наш зямляк, гродзенскі кампазітар Андрэй Бандарэнка ўдастоены Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, і яго музыка ўсё часцей гучыць у канцэртных і тэатральных залах і знаходзіць свайго слухача.

*С.КАЛЧАНАВА, музыказнаўца.*

# ПОЛЬСКІ ХОР «ПАЛІФОНІЯ»

20 студзеня ў актавай зале універсітэта па вул.Леніна прайшоў чарговы канцэрт з цыкла «Універсітэцкія музычныя вечарыны».

На гэты раз перад слухачамі выступаў акадэмічны хор «Паліфонія» з горада Каліша (Польшча), які наведаў наш горад па запрашэнню аддзялення мастацтваў Гродзенскага дзяржуніверсітэта. У выкананні хору прагучалі цудоўныя польскія калядныя песні.

Увогуле, студэнцкі хор «Паліфонія» мастацка-педагагічнага каледжу Познанскага універсітэта вядомы не толькі ў Польшчы. Ён паспяхова выступаў у Германіі, Францыі, Аўстрыі і ў іншых краінах. Асобы гонар хору - канцэрт у Ватыкане.

У Гродна хор «Паліфонія» прыехаў ужо ў другі раз. І зноў, акрамя канцэрта ва універсітэце для выкладчыкаў і студэнтаў, госці выканалі каляды ў гарадскіх касцёлах.

Па словах заснавальніка хору, а сёння дырэктара каледжа прафесара Ежы Рубінськага, дамова аб супрацоўніцтве паміж універсітэтамі працягнута. І ўжо ў сакавіку ў Каліш паедуць нашыя музыканты, а ў маі - жніўні адбудзецца абмен групамі студэнтаў-мастакоў.

*У.ЛЯЎШУК.*



## ТВОРЧАСЦЬ СТУДЭНТАЎ

**НАТАЛЛЯ БЯЛЕНКА,**
**студэнтка III курса**
**факультэта філалогіі**

### *СУСТРЭЧА З ДЗЯЦІНСТВАМ*

Скачуся з горкі, бы ў маленстве.
Здаецца - зноў у дзяцінстве я.
І стане горка, як ад хмелю,
Што не змагу вярнуць ні дня.

А як мне хочацца вярнуцца
ў дзяцінства, у казачныя дні!
Гукну - і рэхам адгукнуцца
Палі, палеткі і лугі.

Успомню - быццам апынуся
Сярод былых сваіх сяброў.
І потым я ўжо не шкадую,
Што не вярнуць мне тых гадоў.

### *ГОРОД СПИТ...*

Вечер город окутал
Темной шалью своей.
Кто же это придумал -
Смену дней и ночей?

Я брожу одиноко
По аллее пустой...
Почему так жестоко
Обошлась жизнь со мной?

В небе звезды мерцают,
Отражаясь в воде,
Я так тихо ступаю
По осенней листве.

Я одна в этот вечер
По аллеям брожу...
Ты явись мне навстречу,
Лишь об этом прошу.

Вот на землю спустилась
Ночи тёмная шаль,
Только светит мне вслед
Одиноко фонарь...

Мой мілы край,
Мая старонка,
Мая бярозка ля акна
І нешырокая дарожка,
Што ад парога пралягла.

Мае сябры, мае сяброўкі,
Мае юнацкія гады,
Каханне, што было нядоўгім,
Чаромхі, вербы ля вады.

Мая радзіма дарагая,
Я так далёка ад цябе!
Заўжды сцяжынкі майго краю
Мяне чакаюць да сябе.



*Драмтэатр.* *Здымак А.Пятрова*

**Прыемнага апетыту!**

## ХОТ-ДОГ НА ГАЗАВАЙ ПЛІЦЕ, ПЯЧЭННЕ ЗА 20 ХВІЛІН, ЛЯСНЫ ЧАЙ І НЕ ТОЛЬКІ...

Для прыгатавання хот-дога спатрэбяцца: каструля, шклянка вады, друшляк, накрыўка, кавалак батона, кавалак варанай каўбасы ці сасіска, сталовая лыжка капусты, сталовая лыжка таматнага соусу, палова чайнай лыжкі сталовай гарчыцы. Наліце ў каструлю ваду, пастаўце на агонь, на каструлю пастаўце друшляк. Батон надрэжце, каб атрымаўся кавалак, падобны на паўраскрытую ракавінку. Улажыце туды кавалак каўбасы ці сасіску і пакладзіце ў друшляк. Закрыйце накрыўкай. Праз 5 хвілін дастаньце батон з каўбасой, раскрыйце, палажыце капусту, заліце таматным соусам і гарчыцай. Вельмі смачна!

ПЯЧЭННЕ ДА ЧАЮ. Тры жаўтка расцерці з 1/2 шклянкі цукру набела. Дабаўце 3 паўзбіваных у пену бялка і 1/2 шклянкі мукі. Цеста трэба браць чайнай лыжкай і класці на змазаны маслам процьвень. Пячэнне пячэцца вельмі хутка. Як толькі края зарумяняцца, адразу вынімайце.

Да такога пячэння патрэбны смачны чай. За ім пойдзем у лес. Раскапайце снег - пад снегам хаваюцца зялёныя сунічныя лісточкі. Нарвіце жменю. А з бліжэйшай сасны сарвіце жменьку іголак. У хаце нарэжце нажніцамі сунічныя лісточкі і сасновыя іголкі - і ў заварачны чайнік. Гэты чай змяшчае ў сябе процьму вітамінаў! Праўда, колер у яго будзе бледненькі, так што можна пры жаданні дабавіць для колеру простага чаю. Піце на здароўе!

Дарэчы, каструля з вадою, друшляк і накрыўка могуць ужывацца не для адных толькі хот-догаў. У іх можна асвяжыць любы чэрствы хлеб. Нарэжце хлеб лустамі і ў друшляк пад накрыўку. Праз 5 хвілін атрымаецца духмяны, цёплы хлеб. Праўда, такі хлеб хутка стане чэрствы, так што з'есці яго трэба адразу. Калі спатрэбіцца, зробіце яшчэ.

Адварныя сасіскі... Фі, якая проза! Паспрабуйце іх падсмажыць. Зніміце з сасіскі цэлафан (паліце яе трошкі гарачай вадою - цэлафан лёгка знімецца), зрабіце нажом на адным баку надрэзы крыж-накрыж. На патэльню пакладзіце трошкі масла, сасіскі і абсмажвайце з усіх бакоў, толькі нядоўга. Паспрабуйце!

Каб адварная бульба атрымалася рассыпістай, пасля таго, як злілі ваду, трэба паставіць каструлю з бульбай на агонь і некалькі разоў страсянуць. Агонь выпарыць рэшткі вільгасці, і бульба будзе смачнейшай. Дарэчы, падсушаная бульба і не пацямнее.

Калі ў вас у лядоўцы заваляўся кавалак сыру і зачэрствеў - не выкідайце яго. Ёсць два спосабы яго ўжывання. Можна нацерці сыр на дробнай тарцы і выкарыстоўваць сырны парашок як пасыпку пры запяканні мяса ці бульбы. А калі кавалак чэрствага сыру пакласці на 2 гадзіны ў малако, ён зноў стане свежым.





## ВІНШУЕМ З НАГОДЫ ЮБІЛЕЮ!

*ПАТРЭБУ МІХАСЯ СЦЯПАНАВІЧА,* старшага выкладчыка кафедры мовазнаўства - з 50-годдзем.

*СЕРБІНА ІВАНА МІХАЙЛАВІЧА,* загадчыка спартыўных збудаванняў - з 50-годдзем.

*ІЗОСІМАВУ ТАЦЦЯНУ МІКАЛАЕЎНУ,* дацэнта кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі - с 40-годдзем.

*КАСЬЯНОВІЧА РЫГОРА РЫГОРАВІЧА,* дацэнта кафедры эканомікі і кіравання - з 60-годдзем.

*РАГОЙШУ АНТОНА ІОСІФАВІЧА,* старшага выкладчыка кафедры матэматыкі і методыкі выкладання матэматыкі - з 70-годдзем.




## Королева красоты

### Гродно - 95

**Фирма "Млади" совместно с Факультетом общественных профессий госуниверситета проводит зональный отборочный тур конкурса "Королева красоты "Гродно-95".**

**К участию приглашаются девушки в возрасте от 16 до 24 лет при росте от 165 см и выше.**

**Желающие принять участие могут обращаться на ФОП: комн. 218 главного корпуса с 11.00 до 13.00 и с 17.00 до 19.00, кроме выходных дней.**

**Mladi**


## Тэст Каліфарнійскага універсітэта

1. Прафесар кладзецца спаць у 8 гадзін вечара, а будзільнік заводзіць на 9 гадзін раніцы. Сколькі будзе спаць прафесар?

2. Ці можа мужчына ажаніцца з сястрою сваёй удавы?

3. Ці ёсць 7 лістапада ў Аўстраліі?

4. У Мамеда 10 авечак. Усе, акрамя 9, здохлі. Сколькі засталося авечак?

5. Вы -пілот самалёта, які ляціць з Гаваны у Маскву з дзвюма пасадкамі ў Алжыры. Сколькі гадоў пілоту?

6. Звычайна месяц заканчваецца лічбай 30 альбо 31. У якім месяцы ёсць лічба 28?

7. Вы ўваходзіце ў малазнаёмы пакой, дзе цёмна. У ім ёсць дзве лямпы: газавая і бензінавая. Што вы запаліце ў першую чаргу?

8. Адзін цягнік накіроўваецца з Масквы ў Санкт-Пецярбург, а другі - з Санкт-Пецярбурга ў Маскву. Выйшлі яны адначасова, але хуткасць першага цягніка ў тры разы вышэй за хуткасць другога. Які цягнік будзе далей ад Масквы падчас іх сустрэчы?

9. Бацька з сынам трапілі ў катастрофу. Бацька памёр у шпіталі. Да сына ў пакой уваходзіць хірург і кажа:« Гэта мой сын». Ці могуць гэтыя словы быць праўдай?

10. Археолагі знайшлі манету, датаваную 35 годам да нашай эры. Ці можа такое быць?

11. На руках 10 пальцаў. Колькі пальцаў на 10 руках?

12. Дошку трэба распілаваць на 12 частак. Колькі спатрэбіцца распілаў?

13. У якой колькасці ўзяў Ной звяроў у свой каўчэг?

14. Урач прапісаў хвораму тры уколы праз кожныя паўгадзіны. Колькі спатрэбіцца часу, каб зрабіць усе ўколы?

15. Колькі лічбаў «9» у радзе лічбаў ад 1 да 100?

16. Адзінокі начны вартаўнік памёр днём. Ці дадуць яму пенсію?

17. Гарэла 7 свечак. Тры згаслі. Колькі свечак засталося?

18. Цагліна важыць 1 кг плюс яшчэ паўцагліны. Колькі важыць цагліна?

19. Пад якім кустом сядзіць заяц падчас дажджу?

***Падлічыце колькасць няправільных адказаў і вызначце, хто вы?***

0-1 - геній;

2-4 - інтэлектуал;

5-6 - нармальны чалавек;

7-8 - радавы ідыёт;

9-10 - радавы ідыёт з пабочнымі з'явамі;

11-12 - абсалютны ідыёт;

14-15 - не здольны мысліць;

16-19 - неабходна ізаляцыя ад грамадства.

***Правільныя адказы:***

1. Адна гадзіна (будзільніку ўсе роўна, ці то раніца, ці то вечар).
2. Не (удава - тая, у якой памёр муж).
3. Ёсць.
4. Дзевяць.
5. Вы - пілот самалёта (пілоту столькі ж гадоў, сколькі вам).
6. Ва ўсіх.
7. Запалку.
8. Аднолькава.
9. Так, калі хірург - маці хлопчыка.
10. Не.
11. 50.
12. 11 распілаў.
13. Кожнай твары - па пары.
14. 1 гадзіна.
15. 20.
16. Не, ён памёр.
17. Тры (згаслі, а астатнія згарэлі).
18. 2 кілаграма.
19. Пад мокрым.





Рэдактары
Н.КРАСНІЦКАЯ,
А.СЦЕПАНЕНКА.
Камп'ютарная вёрстка
А.СЯМЁНАЎ.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не паздзяляючы пункту гледжання аўтара.

Наш адрас:
230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404. Тэл. 44-72-97

Газета выходзіць адзін раз у месяц. Аб'ём газеты - адзін друкаваны аркуш.

Заказ 427
Наклад 500 асобнікаў.

Газета набрана і звёрстана на камп'ютарнай тэхніке выдавецкага аддзела універсітэта, аддрукавана ў Гродзенскай абласной узбуйнёнай друкарні.
Рэгістрацыйнае пасведчанне 421.

Заснавальнікі: Вучоная Рада універсітэта,прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.